## Практычныя заняткі № 2.

## Засваенне метада мазгавога штурма.

Парадак правядзення мазгавога штурма.

1. Калектыў падзяляецца на 2 группы: генератары ідэй і эксперты.
2. Прызначаецца кіраўнік, які дакладна ставіць задачу перад группай генератараў ідэй.
3. На пошук ідэй адводзіцца 20-30 хвілін.
4. Усе ідэі выказваюцца бездоказна, фіксуюцца. У час выказвання ідэй забараняюцца крытычныя выказванні.
5. Эсперты аналізуюць усе ідэі і шукаюць рацыянальнае рашэнне задачы.

### Задача

Пры выплаўцы металу ў доменнай печы ўтвараецца пры тэмпературы 1400 °С расплаўлены шлак. Ён разліваецца ў ёмістасці, устаноўленыя на чыгуначных платформах і перавозіцца на перапрацоўку. У час транспартавання шлак зверху ахаладжваецца і ўтвараецца корка. Пры апаражненні ёмістасці яна паварочваецца. Спачатку корка перашкаджае зліваццa шлаку, а затым расплаўляецца і шлак з вялікай хуткасцю выліваецца ў прыёмную ёмістасць. Пры гэтым кроплі шлаку разлятаюцца на вялікую адлегласць. Неабходна прапанаваць спосаб транпартавання і разліву шлаку, пазбаўлены ўказанага недахопу.